Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!



# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА
ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

№ 15 (139) Аўторак, 8 мая, 1990 года.

## ВІНШУЕМ СА СВЯТАМ ПЕРАМОГІ!

1945-1990




Усё далей у глыбіні гісторыі вогненыя гады Вялікай Айчыннай вайны і дня 9 мая 1945 года. Сімвалічна, што спаўняецца 45 гадоў з дня нашай перамогі ў гэтай вайне. Але не гасне ў памяці народнай веліч падзеі. Усё больш людзей нашай планеты пераконваюцца ў тым, што перамога савецкага народа над чорнымі сіламі фашызму мела сусветна-гістарычнае значэнне, што яна аказала і працягвае аказваць вялікі ўплыў на ўсё пасляваеннае развіццё чалавецтва. Выконваючы свой інтэрнацыянальны абавязак, савецкія воіны дапамаглі выратавацца ад фашысцкага рабства японскага імперыялізму многім краінам Еўропы і Азіі. Разгром фашысцкай Германіі і мілітарысцкай Японіі ўмацаваў сілы міру на зямлі.

У дзяржуніверсітэце на ўліку 33 ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, якія ўдзельнічалі ў бітвах на розных франтах і ў розных напрамках, з баямі вызвалялі ад фашысцкіх захопнікаў нашы народы: Беларусі, РСФСР, Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі, аўтаномнай Калмыцкай савецкай рэспублікі. Вызвалялі і народы іншых краін, у прыватнасці, Польшчы, Румыніі, Венгрыі, Аўстрыі, Чэхаславакіі, Югаславіі. Ва універсітэце ёсць ветэраны, якія ўдзельнічалі ў штурме Берліна, Кенігсберга, у бітве за Сталінград, у абароне Масквы, Ленінграда, у бітве на Курскай дузе і іншых. Пяць нашых удзельнікаў вайны змагаліся ў тыле ворага ў партызанах. Гэта дацэнты Г. А. Марціросаў, М. А. Мельнікаў, С. А. Грыгор´еў, пенсіянер Крыцкі А. І. і іншыя.

Пасля перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне некаторыя нашы ветэраны ўдзельнічалі ў парадзе Перамогі ў Маскве, напрыклад Герой Савецкага Саюза І. Д. Лебедзеў, А. А. Харытонаў. За актыўныя баявыя дзеянні нашы ветэраны вайны ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі.

Неабходна сказаць, што ветэраны вайны і працы карыстаюцца вялікай павагай і прызнаннем калектыву. Іх біяграфіі — гэта жывая гісторыя нашай Радзімы, яе гонар і слава.

Вядома, што адзін з галоўных напрамкаў дзейнасці ветэранскай арганізацыі — клопат аб лепшым выкананні патрэб ветэранаў. За апошні час партыя і ўрад прынялі важныя рашэнні па паляпшэнню матэрыяльна-бытавых умоў жыцця ветэранаў, арганізацыі іх адпачынку і медыцынскага абслугоўвання, пашырэнню заслужаных льгот. Узрастаюць мінімальныя размеры пенсій. Зараз вядзецца падрыхтоўка новага Закона аб пенсіённым забеспячэнні працоўных. Усесаюзная арганізацыя ветэранаў вайны і працы ўдзельнічае ў прыцягненні людзей з багатым жыццёвым вопытам да грамадска-палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця краіны, і перш за ўсё да выхавання падрастаючага пакалення ў духу савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, дружбы народаў СССР, свядомых адносін да працы, вучобы, воінскай службы, пастаяннай гатоўнасці да аховы сацыялістычнай айчыны.

П. ВАСІЛЬЕЎ,
старшыня савета ветэранаў вайны і працы дзяржуніверсітэта імя Я. Купалы.

## ПОМНИТЕ!

Когда, скажи, страна моя,
Твои искупятся страданья
И время в сердце заживит
Все кровоточащие раны?

Нет больше счастья в мире жить,
Любимым быть, детей растить,
Заветы помнить прошлых лет,
Не зная горя, слез и бед.

А память — хрупкое стекло.
Мы плохо помним, что ушло.
Но прошлых лет, чтоб мирно жить,
Никто не вправе позабыть.

Война — разлука, слезы, боль,
И в ней всегда горька любовь,
Но чтобы в битвах победить,
Народ мы свой должны любить.

И эту истину в бою
Солдаты верно берегли,
И жажду мира всей Земли
С любовью в сердце пронесли.

Забыт не будет подвиг ваш,
Тюленин, Карбышев, Курбатов.
И сотни, тысячи таких же
Отважных, верных, молодых,
Что спят в курганах, под гранитом,
На братских кладбищах,
залитых слезами вдов и матерей.

Из книжек, фильмов и газет
Мы — поколенье этих лет,
Должны урок себе извлечь,
Чтоб дух войны мечом рассечь.

СВЯТЛАНА ПРЫВАЛАВА,
студэнтка 1 курса факультэта педагогікі і методыкі пачатковага

